


# Сусветны дзень водных рэсурсаў

# 22 сакавіка –
# Сусветны дзень водных рэсурсаў

Ідэя правядзення Сусветнага дня водных рэсурсаў упершыню прагучала на Канферэнцыі ААН па ахове навакольнага асяроддзя і развіццю (ЮНСЕД), якая адбылася ў 1992 годзе ў Рыа-дэ-Жанейра. Генеральная Асамблея ААН, прыняўшы рэзалюцыю 47/193 ад 22 лютага 1993 года, абвясціла 22 сакавіка Сусветным днём водных рэсурсаў. Дзяржавы былі закліканы прысвяціць Дзень водных рэсурсаў ажыццяўленню рэкамендацый ААН і правядзенню канкрэтных дзеянняў на нацыянальным узроўні.

Асноўнымі мэтамі правядзення гэтага Дня з’яўляюцца: спрыянне прыняццю адпаведных мер для рашэння праблемы забеспячэння насельніцтва пітной вадой; інфармаванне грамадскасці пра важнасць аховы і захавання рэсурсаў прэснай вады і водных рэсурсаў у цэлым; далучэнне да святкавання Сусветнага дня водных рэсурсаў урадаў, міжнародных агенцтваў, няўрадавых арганізацый і прыватнага сектара розных краін свету.

***22 сакавіка з'яўляецца унікальнай магчымасцю нагадаць чалавецтву аб надзвычайнай важнасці водных рэсурсаў для навакольнага асяроддзя і развіцця грамадства.***

***Бяседавіцкая бібліятэка флоры і фаўны нагадвае, што вада – аснова чалавечага жыцця і адзін з найбольш каштоўных прыродных рэсурсаў, без яе немагчыма было б чалавечае існаванне. Беражыце водныя рэсурсы!***